# ЖЫЦЦЁ, АДДАДЗЕНАЕ НАРОДУ



*Да 70-годдзя з дня нараджэння С. О. Прыцыцкага*

«САВЕЦКАЯ ўлада — гэта самая чалавечная, самая народная, самая рэвалюцыйная, самая справядлівая, самая магутная ў свеце ўлада. Нам патрэбна такая ўлада, мы будзем усе, як адзін, галасаваць за такую ўладу». Гэтыя пранікнёныя словы былі сказаны ў Беластоку . 28 кастрычніка 1939 года на Народным сходзе Заходняй Беларусі мужным камуністам — прафесіянальным рэвалюцыянерам С. О. Прытыцкім.

Усё жыццё і кіпучая дзейнасць Сяргея Осіпавіча Прытыцкага (1913—1971) непарыўна звязана з рэвалюцыйнай барацьбой працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз'яднанне са сваімі братамі ў СССР, з будаўніцтвам сацыялізму і камунізму ў нашай краіне.

Нарадзіўся С. О. Прытыцкі 1 лютага 1913 года ў вёсцы Гаркавічы Сакольскага павета Гродзенскай губерні ў беднай сялянскай сям'і. У пачатку імперыялістычнай вайны яна выехала ў глыбіню Расіі, пад Пензу. У 1921 годзе Прытыцкія вярнуліся ў родныя краі, якія ўваходзілі тады ў састаў буржуазнай Польшчы. Бацька меў паўтары дзесяціны зямлі, а сям'я была з васьмі чалавек. Не было свайго дома, не было сродкаў для існавання. Як успамінаў С. О. Прытыцкі, «з маладых гадоў мне прыйшлося на ўласнай спіне адчуць сацыяльны прыгнёт і класавую несправядлівасць».

Заходнюю Беларусь, адарваную ў 1920 годзе ад маладой Савецкай Рэспублікі, узрушалі класавыя баі пралетарыяту, рэвалюцыйныя выступленні сялян. Не стаялі ў баку ад барацьбы супраць прыгнятальнікаў і Прытыцкія. Старэйшы брат Аляксандр з'яўляўся членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі з першых дзён яе нараджэння. Ён часта даваў Сяргею чытаць падпольную камуністычную літаратуру.

Пад уплывам ідэй Вялікага Кастрычніка, вестак аб будаўніцтве новага жыцця ў СССР С. О. Прытыцкі становіцца на шлях актыўнай рэвалюцыйнай барацьбы супраць эксплуататараў, за лепшае жыццё для ўсіх гаротных. У 1931 годзе ён уступае ў камсамол Заходняй Беларусі, а ў наступным годзе быў прыняты ў члены КПЗБ. У радах партыі С. О. Прытыцкі глыбока засвоіў нялёгкую навуку класавай барацьбы, увабіў у сабе лепшыя рысы камуніста ленінскага тыпу: ідэйную перакананасць, рэвалюцыйную стойкасць, бязмежную адданасць справе партыі і працоўнага народа, любоў да Савецкага Саюза — першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян.

Неўзабаве С. О. Прытыцкі становіцца важаком рэвалюцыйнай моладзі, выбіраецца сакратаром Крынкаўскага падпольнага райкома камсамола, а затым — сакратаром Гродзенскага акругкома КСМЗБ. Ён выступае на нелегальных сходках, арганізоўвае распаўсюджанне камуністычнай літаратуры, стварае новыя камсамольскія ячэйкі.

У маі 1933 года С. О. Прытыцкі быў арыштаваны. Катаванні ў гродзенскай дэфензіве (палітычная паліцыя) не зламалі рэвалюцыянера. З-за адсутнасці важкіх доказаў яго выпусцілі на волю пад нагляд паліцыі.

Нягледзячы на паліцэйскае сачэнне, С. О. Прытыцкі паспяхова працягваў рэвалюцыйную дзейнасць. У канцы 1933 года пад кіраўніцтвам КПЗБ пачалася забастоўка лясных рабочых Беластоцкага ваяводства, якая з'явілася важнай падзеяй у рэвалюцыйнай барацьбе працоўных Заходняй Беларусі. Забастоўшчыкі патрабавалі павышэння заработнай платы, спынення тэрору з боку паліцыі, асуджалі нацыянальны прыгнёт. Сяргей Осіпавіч быў адным з кіраўнікоў забастоўкі, ён арганізоўваў мітынгі і стачкі салідарнасці ў падтрымку барацьбы рабочых, збор грашовых сродкаў і прадуктаў для аказання дапамогі бастуючым.

Жорстка праследуючы Кампартыю, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, польская дэфензіва шырока карысталася гнюснымі сродкамі правакацыі. Практыкавалася і засылка ў рэвалюцыйныя арганізацыі агентаў, якія выдавалі ў рукі паліцыі актывістаў, а іншы раз цэлыя партыйныя і камсамольскія арганізацыі.

Адным з такіх небяспечных правакатараў у пачатку трыццатых гадоў быў кулацкі сынок Я. Стрэльчук. Па заданню дэфензівы ён прабраўся ў камсамол, у яго кіруючыя органы.

У выніку здрадніцтва Стрэльчука ў турмы былі кінуты сотні камуністаў і камсамольцаў. На масавых судовых працэсах ён выступаў у якасці галоўнага сведкі абвінавачання. У кіраўніцтве КПЗБ было прынята рашэнне абясшкодзіць паліцэйскага агента. Выканаць гэта рызыкоўнае заданне ўзяўся Сяргей Прытыцкі. У далейшым ён расказваў, што загадзя быў на 99 працэнтаў упэўнены ў тым, што пападзе ў лапы дэфензівы, а гэта азначала верную смерць. Але нішто не спыніла палымянага камуніста. Інтарэсы партыі, народа, таварышаў па барацьбе былі для яго вышэй за ўсё, даражэй за жыццё.

27 студзеня 1936 года ў зале пасяджэння віленскага акруговага суда Сяргей Осіпавіч ва ўпор страляў у правакатара, калі той даваў паказанні супраць групы падсудных камуністаў і камсамольцаў. Пры спробе скрыцца С. О. Прытыцкага цяжка паранілі і схапілі. У чэрвені 1936 года тым жа віленскім акруговым судом ён прыгаворваецца за рэвалюцыйную дзейнасць у радах КПЗБ да 15 гадоў турэмнага зняволення, за замах на правакатара ў час судовага разбору — да смяротнай кары праз павешанне.

Імя Сяргея Осіпавіча Прытыцкага стала блізкім і дарагім усім барацьбітам, прагрэсіўным людзям, як сімвал рэдкай смеласці і самаадданасці. Для выратавання чалавека, які зрабіў геройскі ўчынак у імя справядлівасці на зямлі, разгарнулася шырокая кампанія. Яна праходзіла пад лозунгам «Прытыцкі павінен жыць!» На абарону адважнага камуніста ўзняліся не толькі працоўныя Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, але і Чэхаславакіі, Англіі, ЗША, іншых капіталістычных краін. Масавыя мітынгі і сходы праходзілі ў СССР. На іх савецкія людзі патрабавалі ад польскага ўрада адмены смяротнага прыгавору С. О. Прытыцкаму і яго вызвалення.

Пад націскам сусветнай грамадскасці польскія кіруючыя колы вымушаны былі замяніць смяротны прыгавор пажыццёвым турэмным зняволеннем. Жорсткі турэмны рэжым, паўтара года ў камеры для смяротнікаў не зламалі баявы дух выдатнага камуніста, яго рашучасць змагацца за справядлівую справу працоўных.

Верасень 1939 года. Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь ад буржуазна-памешчыцкага прыгнёту. Тысячы палітзняволеных выйшлі з турмаў буржуазнай Польшчы, і сярод іх — С. О. Прытыцкі. Ён адразу ж становіцца ў першыя рады будаўнікоў новага жыцця. Як вернага свайго сына, рабочыя і сяляне выбіраюць Сяргея Осіпавіча дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі. Яму даручаюць выступіць у Народным сходзе з дакладам па асноўнаму пытанню, аб форме дзяржаўнай улады.

А. МАЦКО,
доктар гістарычных навук,
прафесар.

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*